# § 13. Палітычнае развіццё Савецкай дзяржавы

*1. Якія прынцыпы нацыянальнай палітыкі былі абвешчаны савецкай уладай? 2. Якія тэрытарыяльныя змены адбыліся з Расіяй пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны?*

Найважнейшым вынікам Кастрычніцкай рэвалюцыі стала з'яўленне на палітычнай карце свету новай краіны — Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. У ім быў пабудаваны дзяржаўны сацыялізм і надзвычайнымі тэмпамі ажыццёўлена мадэрнізацыя эканомікі, грамадства і дзяржавы. Дзяржаўны сацыялізм савецкага тыпу з'явіўся іншай, альтэрнатыўнай капіталізму, мадэллю індустрыяльнага развіцця грамадства.

**Утварэнне СССР і яго гістарычнае значэнне.** Гістарычныя, эканамічныя і палітычныя перадумовы падштурхоўвалі бальшавікоў да адраджэння адзінай дзяржавы на тэрыторыі былой Расійскай імперыі. Цэнтрам аб'яднання стала РСФСР.

Народны камісар па справах нацыянальнасцяў ***І. В. Сталін*** прапаноўваў уключыць усе савецкія рэспублікі, якія існавалі тады, у склад Расійскай Федэрацыі. Згодна з яго *планам «аўтанамізацыі»* Расія павінна была застацца адзінай і непадзельнай дзяржавай, у межах якой усім народам па іх жаданні дазвалялася ствараць ***аўтаномію***.

Ленінскі *план федэрацыі* прадугледжваў атрыманне ўсімі народамі, якія пажадаюць, незалежнасці і дзяржаўнасці і толькі потым аб'яднанне з Расіяй у раўнапраўнай ***федэрацыі***. У выніку ***30 снежня 1922 г.*** быў утвораны ***Саюз Савецкіх Сацы-***

Сувязь часоў



Падпісанне дагавора аб утварэнні СССР на I Усесаюзным з'ездзе Саветаў. Мастак *С. Дуднік*. 1936 г. 8 снежня 1991 г. кіраўнікі трох рэспублік — заснавальніц СССР (Расіі, Беларусі і Украіны) падпісалі Пагадненне аб спыненні існавання Савецкай дзяржавы

Правообладатель Издательский центр БГУ

***ялістычных Рэспублік (СССР)***, якія аб'яднаў РСФСР, Украінскую ССР, Беларускую ССР і Закаўказскую СФСР (у складзе Грузіі, Арменіі, Азербайджана). Гэта падзея прывяла да ўмацавання ваеннай магутнасці і эканамічнага патэнцыялу Савецкай дзяржавы. Насуперак ідэі Леніна СССР, па сутнасці, быў ператвораны ў адзіную цэнтралізаваную дзяржаву.

**Асноўныя рысы савецкай палітычнай сістэмы.** Эканамічную аснову сістэмы склалі поўнае падпарадкаванне вытворцы дзяржаве, дзяржаўнае рэгуляванне і пазаэканамічны прымус, забарона забастовак, мілітарызацыя эканомікі і працы.

Палітычную аснову характарызавалі панаванне аднапартыйнай сістэмы, зрошчванне партыйнага і дзяржаўнага апарату, знішчэнне палітычных апанентаў, стварэнне магутных рэпрэсіўных структур. На пасады кіраўнікоў у дзяржаве прызначаліся выключна камуністы — члены Усесаюзнай камуністычнай партыі (бальшавікоў), альбо ВКП(б). Ніводны орган савецкай улады не мог прымаць рашэнні без санкцыі партыйных камітэтаў. Для ўзмацнення кантролю над рознымі пластамі грамадства ствараліся масавыя грамадскія арганізацыі. Такім чынам, партыя бальшавікоў з палітычнай ператварылася ў кіраўніцкую.

Важную ролю ў тагачаснай палітычнай сітуацыі адыгрывала асоба правадыра. Першапачаткова ім быў У. І. Ленін, а затым гэтага статусу дамогся І. В. Сталін, які атрымаў перамогу над сваімі канкурэнтамі ў жорсткай унутрыпалітычнай барацьбе. Важныя пасады ў дзяржаве занялі рэвалюцыянеры-паплечнікі В. М. Молатаў, К. Я. Варашылаў, Л. М. Кагановіч, С. Арджанікідзэ, а ў далейшым — маладыя вылучэнцы Сталіна Г. М. Малянкоў, Л. П. Берыя, М. С. Хрушчоў, С. М. Кіраў, А. М. Касыгін, А. А. Грамыка і інш.

На XVII з'ездзе ВКП(б), які адбыўся ў студзені — лютым 1934 г., значная частка дэлегатаў прагаласавала супраць І. В. Сталіна падчас выбараў у ЦК партыі. Новым Генеральным сакратаром павінен быў стаць ***С. М. Кіраў*** — кіраўнік партыйнай арганізацыі Ленінграда. Аднак ён адмовіўся ад гэтай пасады на карысць Сталіна. Пасля гэтай падзеі партыйныя з'езды ўжо не праводзіліся рэгулярна.

У снежні 1934 г. адбылося загадкавае забойства С. М. Кірава, якое І. В. Сталін выкарыстаў для разгортвання ў краіне палітычных ***рэпрэсій***.

Рэпрэсіі праводзіліся і раней. Але ў другой палове 1930-х гг. яны набылі масавы характар. Сталінскае кіраўніцтва баялася, што ў выпадку вайны ў СССР могуць узнікнуць варожыя арганізацыі і групоўкі з ліку асоб, незадаволеных бальшавіцкай уладай. Таму былі прынятыя папераджальныя меры па ліквідацыі рэальных і патэнцыйна магчымых апанентаў. Па абвінавачванні ў палітычных злачынствах толькі ў 1937—1938 гг. былі арыштаваны каля 2 млн чалавек, з якіх амаль 800 тыс. расстраляны. Рэпрэсавалі большасць дэлегатаў «бунтарскага» XVII з'езда ВКП(б). Былі асуджаны і расстраляны як ворагі народа нядаўнія саратнікі Сталіна ў барацьбе за ўладу — Р. Я. Зіноўеў, Л. Б. Каменеў, М. І. Бухарын і інш., а таксама фізічна знішчаны многія вядомыя военачальнікі.

Правообладатель Издательский центр БГУ




Плакат «Быць такімі, якім быў вялікі Ленін». Мастак *В. М. Ёлкін*. 1938 г.

Да канца 1930-х гг. у краіне канчаткова склаўся ***культ асобы*** Сталіна. Сістэма культу ўключала стварэнне вобраза правадыра як звышнатуральнай асобы і ўзвядзенне яго ў ранг найвялікшых мысляроў разам з К. Марксам, Ф. Энгельсам і У. І. Леніным, паўсюднае ўвасабленне кіраўніка Савецкай дзяржавы (помнікі, бюсты, партрэты, плакаты).

Духоўнае жыццё ў СССР характарызавалася ўсталяваннем дзяржаўнага кантролю над сродкамі масавай інфармацыі, літаратурай і мастацтвам, аддзяленнем царквы ад дзяржавы, стварэннем спецыяльных ідэалагічных арганізацый і ўстаноў з мэтай тлумачэння афіцыйнай ідэалогіі, барацьбой з іншадумствам.

Палітычная сістэма, створаная партыяй бальшавікоў, стала важным інструментам паскоранай сацыялістычнай мадэрнізацыі і пабудовы індустрыяльнай базы, без якіх шматнацыянальная Савецкая дзяржава не змагла б вытрымаць сутыкнення з ваеннай машынай фашысцкай Германіі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

№ 11

*5 снежня 1936 г.* была прынятая новая Канстытуцыя СССР. Усе грамадзяне СССР надзяляліся роўнымі правамі, дэклараваліся асноўныя правы і свабоды чалавека, пры гэтым абвяшчаліся дыктатура пралетарыяту і ўлада Саветаў. Амаль усе народы СССР атрымлівалі фармальна права на дзяржаўнасць рознага ўзроўню (саюзная рэспубліка, аўтаномная акруга і інш.). Аднак не ўсе палажэнні Канстытуцыі ажыццяўляліся на практыцы.

*Якія рэспублікі ўваходзілі ў склад СССР на пачатак 1940 г.?*

**Развіццё адносін з краінамі Захаду.** Галоўная задача савецкай знешняй палітыкі ў 1920-я гг. заключалася ў тым, каб забяспечыць міжнароднае прызнанне новай улады і стварыць спрыяльныя мірныя ўмовы для ўнутраных пераўтварэнняў.

У канцы 1920 — пачатку 1921 г. урад РСФСР падпісаў мірныя дагаворы з Фінляндыяй, Эстоніяй, Латвіяй, Літвой, Польшчай.

Па меры ўмацавання Савецкай дзяржавы заходнія краіны, якія спрабавалі першапачаткова яе байкатаваць, распачалі перамовы з мэтай усталявання нармальных дыпламатычных і гандлёвых адносін. Прарывам стаў Рапальскі дагавор з Германіяй, падпісаны ў красавіку ***1922 г.*** Неўзабаве адбылося дыпламатычнае пры-

Правообладатель Издательский центр БГУ



Г. К. Жукаў з байцамі ў час бітваў у раёне ракі Халхін-Гол (Мангольская Народная Рэспубліка). 1939 г.

знанне і з боку іншых буйны́х еўрапейскіх дзяржаў. У *1924 г.* СССР усталяваў дыпламатычныя адносіны з Вялікабрытаніяй і Францыяй. Апошняй вядучай дзяржавай, якая прызнала СССР у *1933 г.*, былі ЗША.

Развіццё міжнародных падзей у 1930-я гг. сур'ёзна пагражала бяспецы СССР. Ва Усходняй Азіі Японія ў 1931 г. акупавала Маньчжурыю. У *1938 г.* японскія войскі ўварваліся на тэрыторыю СССР у раёне *возера Хасан*, а ў наступным годзе напалі на Мангольскую Народную Рэспубліку, з якой СССР быў звязаны саюзніцкімі адносінамі. У абодвух выпадках Чырвоная Армія дала рашучы адпор агрэсару. Тым самым Савецкі Саюз прадэманстраваў гатоўнасць абараніць сябе. У выніку ў *красавіку 1941 г.* у Маскве быў падпісаны *савецка-японскі пакт аб нейтралітэце*. Ён прадухіліў напад Японіі на СССР пасля пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

Прыход нацыстаў да ўлады ў Германіі спарадзіў яшчэ адну сур'ёзную пагрозу. Савецкае кіраўніцтва пачало шукаць саюзнікаў у антыфашысцкай барацьбе сярод іншых еўрапейскіх дзяржаў, перш за ўсё Францыі і Вялікабрытаніі. У *верасні 1934 г.* СССР далучыўся да Лігі Нацый. СССР неаднаразова заклікаў членаў гэтай міжнароднай арганізацыі прыняць меры для забеспячэння *калектыўнай бяспекі* супраць магчымай агрэсіі фашысцкіх дзяржаў.

**Барацьба СССР за стварэнне сістэмы калектыўнай бяспекі.** Улетку 1938 г. паўстаў сур'ёзны крызіс, калі Германія выказала Чэхаславакіі прэтэнзіі на Судэцкую вобласць. СССР прапанаваў Чэхаславакіі падтрымку і заклікаў Францыю і Вялікабрытанію зрабіць тое ж самае. Замест гэтага французскі і брытанскі ўрады праводзілі палітыку «прымірэння», вынікам якой стаў Мюнхенскі пакт ад 30 верасня 1938 г. і акупацыя Чэхаславакіі ў сакавіку 1939 г. Няпэўная і эгаістычная палітыка буйны́х еўрапейскіх дзяржаў вымусіла І. В. Сталіна ў адзіночку вырашаць праблему бяспекі Савецкай дзяржавы.

Правообладатель Издательский центр БГУ

У гэтай няпростай сітуацыі вясной 1939 г. І. В. Сталін стаў шукаць магчымасці заключэння саюзу з Англіяй і Францыяй на выпадак нямецкай агрэсіі ў Еўропе. Аднак англа-французская дыпламатыя ўпарта прытрымлівалася палітыкі «прымірэння». Між тым А. Гітлер настойліва прапаноўваў І. В. Сталіну заключыць пакт аб ненападзе. Пры гэтым германскае кіраўніцтва давала зразумець, што ў выпадку адмовы гатова дамовіцца аб збліжэнні з Англіяй. Такім чынам, палітыка «прымірэння» падштурхнула Сталіна да падпісання дагавора з Германіяй.

*Дагавор аб ненападзе паміж Германіяй і СССР* і сакрэтны пратакол да яго былі падпісаны 23 жніўня 1939 г. у Маскве міністрам замежных спраў Германіі І. фон Рыбентропам і народным камісарам па замежных справах СССР В. М. Молатавым. Бакі дамаўляліся не дапусціць ваеннага сутыкнення і размяжоўвалі «сферы дзяржаўных інтарэсаў» паміж Германіяй і СССР. Пасля таго як пачалася Другая сусветная вайна, *28 верасня 1939 г.* Германія і СССР падпісалі *Дагавор аб дружбе і граніцы* і новыя сакрэтныя пратаколы, якія ўдакладнялі сферы інтарэсаў дзвюх краін.

Савецкае кіраўніцтва, якое не сумнявалася ў ваенным сутыкненні з гітлераўскай Германіяй, атрымала перадышку. Яно імкнулася з максімальнай выгадай выкарыстаць гэты час для падрыхтоўкі да вайны. Што ж тычыцца заходніх краін, то яны неўзабаве самі сталі ахвярай уласнай палітыкі «прымірэння» і імкнення падштурхнуць фашысцкага агрэсара да вайны на ўсходнім кірунку.

1. Вызначце ідэалагічныя, палітычныя, эканамічныя перадумовы ўтварэння СССР.
2. Якія планы стварэння адзінай дзяржавы існавалі ў партыйнага кіраўніцтва? У чым іх прынцыповае адрозненне?
3. Ахарактарызуйце палітычную сістэму, якая склалася ў СССР да пачатку Вялікай Айчыннай вайны.
4. Растлумачце значэнне паняцця «культ асобы». Якія прычыны прывялі да з’яўлення культу асобы Сталіна?
5. Складзіце храналагічную табліцу «Міжнароднае прызнанне СССР». Ахарактарызуйце міжнароднае становішча СССР у міжваенны перыяд. Вызначце асноўныя напрамкі знешняй палітыкі СССР у гэтыя гады.
6. Якое значэнне мела ўтварэнне СССР?

Германа-савецкі дагавор аб ненападзе да гэтага часу не мае адназначнай ацэнкі і выклікае спрэчкі. Дзеянні савецкага кіраўніцтва ацэньваюцца альбо як вераломны крок, які даў Гітлеру магчымасць развязаць Другую сусветную вайну, альбо як вымушаная мера. Ці было ў Савецкага Саюза іншае выйсце ў тагачаснай сітуацыі?

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Са Справаздачнага даклада І. В. Сталіна на XVIII з'ездзе партыі аб рабоце ЦК ВКП(б). 10 сакавіка 1939 г.**

Кадры партыі — гэта камандны састаў партыі, а з той прычыны, што наша партыя знаходзіцца ва ўладзе, яны з'яўляюцца таксама камандным саставам кіроўных дзяржаўных органаў. Пасля таго як выпрацавана правільная палітычная лінія, правераная на практыцы, кадры партыі становяцца вырашальнай сілай партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва… Правільная палітычная лінія патрэбна не для дэкларацыі, а для ўкаранення ў жыццё. Але, каб ажыццявіць правільную палітычную лінію, патрэбны кадры, патрэбны людзі, якія разумеюць палітычную лінію партыі, якія ўспрымаюць яе як сваю ўласную лінію, гатовыя яе праводзіць, якія ўмеюць рэалізоўваць яе на практыцы і здольныя адказваць за яе, абараняць яе, змагацца за яе. Без гэтага правільная палітычная лінія рызыкуе застацца на паперы.



Выступленне І. В. Сталіна на XVIII з'ездзе ВКП (б). Мастак *А. Герасімаў*. 1939 г.

*Якую ролю ў палітычнай сістэме Савецкага Саюза адыгрывала партыя бальшавікоў? Растлумачце, як адбывалася зрошчванне партыйнага і дзяржаўнага апарату.*

## § 14. Культурныя пераўтварэнні ў СССР

*1. Ахарактарызуйце сістэму адукацыі ў Расіі да Кастрычніцкай рэвалюцыі. 2. Назавіце адметныя рысы перыяду ў развіцці культуры Расіі, які атрымаў назву «срэбнае стагоддзе».*

Развіццё савецкай культуры насіла супярэчлівы характар. З аднаго боку, аб'ектыўна патрабавалася павысіць пісьменнасць насельніцтва, развіваць новыя напрамкі навукі, рыхтаваць кадры навукова-тэхнічнай інтэлігенцыі ў адпаведнасці з задачамі будаўніцтва індустрыяльнага грамадства. З іншага боку, савецкая ўлада ставіла найважнейшай мэтай умацаванне свайго ідэалагічнага ўплыву ў грамадстве, актыўна выкарыстоўваючы для гэтага магчымасці літаратуры, мастацтва, грамадскіх навук. Рэвалюцыйныя падзеі падзялілі навуковую і творчую інтэлігенцыю на тых, хто адмовіўся супрацоўнічаць з савецкай уладай і пакінуў радзіму, і тых, хто, прыняўшы рэвалюцыю, удзельнічаў у стварэнні новай культуры. Культурныя пераўтварэнні, звязаныя з ліквідацыяй непісьменнасці, стварэннем новай савецкай школы, падрыхтоўкай кадраў «народнай інтэлігенцыі», развіццём навукі, літаратуры, мастацтва пад партыйным кантролем і на аснове марксісцка-ленінскай ідэалогіі, атрымалі назву «культурная рэвалюцыя».

**Ліквідацыя масавай непісьменнасці.** Праца па ліквідацыі непісьменнасці пачалася яшчэ ў гады Грамадзянскай вайны. Было створана Таварыства «Далоў непісьменнасць». У яго кіраўніцтва ўваходзілі выбітныя партыйныя дзеячы Савецкай дзяржавы.

Правообладатель Издательский центр БГУ